9(476)
Г 516

# Гісторыя беларускай дзяржаўнасці

## ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.

2

кніга

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
Інстытут гісторыі

# ГІСТОРЫЯ
# БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
## ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.

*У дзвюх кнігах*

Кніга 2

БГПУ БИБЛИОТЕКА
ИНВ. № 1708829
132

Мінск
«Беларуская навука»
2012

УДК 94(476)"17/20"
БКК 63.3(4Беи)5
Г30

А ў т а р ы:

М. У. Смяховіч, А. А. Каваленя, В. В. Даніловіч, М. П. Касцюк,
М. Г. Жылінскі, У. В. Здановіч, А. Ф. Вялікі, У. Ф. Ладысеў, В. Г. Мазец,
М. Б. Несцяровіч, І. А. Валахановіч, Н. Я. Новік, А. В. Ціхаміраў, С. М. Хоміч,
М. М. Забаўскі, А. П. Жытко, М. С. Сташкевіч, А. У. Унучак, А. М. Філатава

Р э д а к ц ы й н а я  к а л е г і я:

А. А. Каваленя (галоўны рэдактар), М. У. Смяховіч (намеснік гал. рэд.),
В. Ф. Голубеў, В. В. Даніловіч, М. Г. Жылінскі, М. М. Забаўскі, М. П. Касцюк,
А. М. Літвін, В. Г. Мазец, М. Б. Несцяровіч, А. А. Яноўскі, Э. С. Ярмусік

Р э ц э н з е н т ы:

доктар гістарычных навук прафесар П. І. Зялінскі,
доктар гістарычных навук прафесар М. К. Сакалоў,
доктар гістарычных навук прафесар А. М. Вабішчэвіч

*Выданне падрыхтавана ў рамках выканання Дзяржаўнай комплекснай праграмы навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры» (навуковы кіраўнік праграмы – доктар гістарычных навук прафесар А. А. Каваленя). Заданне «05» – «Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці ў геапалітычных працэсах XIX–XX.стст.» (навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук дацэнт М У. Смяховіч)*

*У кнізе выкарыстаны фотаздымкі з Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў, фотахронікі БелТА, архіваў Інстытута гісторыі НАН Беларусі і выдавецкага дома «Беларуская навука»*

**ISBN 978-985-08-1487-6 (кн. 2)**
**ISBN 978-985-08-1308-4**

© Інстытут гісторыі НАН Беларусі, 2012
© Афармленне. РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука», 2012

## ЗМЕСТ

Раздзел I. **Гістарыяграфія і крыніцы** (*В. Даніловіч, М. Жылінскі, У. Здановіч, А. Каваленя, М. Касцюк, В. Мазец, М. Несцяровіч, М. Смяховіч*) . . . . . . . . . . . . . . . 5

Раздзел II. **Беларуская дзяржаўнасць напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны (1939–1941 гг.)** . . . . . . . . . . . . . . . 35

2.1. Беларусь напярэдадні і ў пачатку Другой сусветнай вайны (*В. Даніловіч, А. Каваленя, У. Ладысеў*) . . . . . . . . . . . . . . . 35

2.2. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Тэрытарыяльна-адміністрацыйныя і грамадска-палітычныя змены (*В. Даніловіч, А. Каваленя, У. Ладысеў*) . . . . 45

Раздзел III. **Беларуская дзяржаўнасць у выпрабаваннях Вялікай Айчыннай вайны (1941–1945 гг.)** . . . . . . . . . . . . . . . 65

3.1. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны: акупацыя Беларусі, прыпыненне дзейнасці органаў савецкай улады (*М. Жылінскі, У. Здановіч, А. Каваленя*) . . 65

3.2. Акупацыйная палітыка германскіх агрэсараў: рабаванне, тэрор, генацыд (*М. Жылінскі, У. Здановіч, А. Каваленя*) . . . . . . . . . . . . . . . 87

3.3. Рух антыгерманскага супраціўлення: ідэалагічная і ўзброеная барацьба (*М. Жылінскі, У. Здановіч, А. Каваленя*) . . . . . . . . . . . . . . . 114

Раздзел IV. **Савецкая Беларусь у сістэме міжнародных адносін (1944–1991 гг.)** . . . . . . . . . . . . . . . 136

4.1. Вызначэнне і дэмаркацыя беларускага ўчастка савецка-польскай граніцы (1944–1948 гг.) (*А. Вялікі*) . . . . . . . . . . . . . . . 136

4.2. Барацьба супраць антысавецкіх арганізацый і груп (1944–1953 гг.) (*І. Валахановіч, В. Мазец*) . . . . . . . . . . . . . . . 159

4.3. Знешнепалітычная дзейнасць (*А. Ціхаміраў*) . . . . . . . . . . . . . . . 174

Раздзел V. **Дзяржаўнае будаўніцтва ў Савецкай Беларусі (1944–1991 гг.)** . . . . 183

5.1. Аднаўленне і развіццё органаў улады (1944–1953 гг.) (*М. Несцяровіч*) . . . 183

5.2. Сістэма дзяржаўнай улады і кіравання ў 1954–1964 гг. (*М. Несцяровіч*) . 201

5.3. Функцыянаванне дзяржаўнага механізма ў 1965–1991 гг. (*М. Несцяровіч*) . . . . . . . . . . . . . . . 224

Раздзел VI. **Дзяржаўнае і грамадска-палітычнае жыццё ў БССР (1944–1991 гг.)** . . . 250

6.1. Узмацненне ідэйна-палітычнай работы (1944–1953 гг.) (*В. Мазец, М. Несціяровіч*) . . . 250

6.2. Палітычныя рэформы 1954–1964 гг. (*В. Мазец, М. Несцяровіч*) . . . 276

6.3. Перыяд «развітога сацыялізму» (1965–1984 гг.) (*В. Мазец, М. Несцяровіч*) . . . 310

6.4. Супярэчнасці перабудовы (1985–1991 гг.) (*В. Мазец, М. Несцяровіч*) . . . 337

Раздзел VII. **Геапалітычныя працэсы і дзяржаўнасць Беларусі ў другой палове 1980-х – пачатаку 1990-х гадоў** . . . 376

7.1. Чарнобыльская катастрофа – выпрабаванне для народа і дзяржавы (*С. Хоміч*) . . . 376

7.2. Геапалітычныя выклікі і перадумовы дзяржаўнага суверэнітэту Беларусі (*М. Касцюк*) . . . 398

Раздзел VIII. **Рэспубліка Беларусь: дэмакратызацыя грамадства, улады, партыі** . . . 418

8.1. Ад Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце да Канстытуцыі: фарміраванне органаў улады і кіравання (*М. Несцяровіч*) . . . 418

8.2. Станаўленне і развіццё інстытута прэзідэнцкай улады (*М. Смяховіч*) . . . 438

8.3. Палітычныя партыі: удзел у грамадскім жыцці (*С. Зенчанка, М. Смяховіч*) . . . 501

8.4. Знешняя палітыка (*А. Ціхаміраў, Н. Новік*) . . . 554

**Заключэнне** . . . 601

**Дадаткі** . . . 607

**Храналогія** (*К. Ганчарэнка, А. Фірыновіч*) . . . 609

**Імянны паказальнік па 1-й кнізе** (*Р. Зянюк, А. Фірыновіч*) . . . 634

**Імянны паказальнік па 2-й кнізе** (*К. Ганчарэнка*) . . . 646

# ЗАКЛЮЧЭННЕ

Аналіз шырокага кола апублікаванай айчыннай і замежнай літаратуры, выкарыстанне шэрага невядомых раней архіўных крыніц дазволілі супаставіць і пераасэнсаваць існаваўшыя ў айчыннай гістарыяграфіі падыходы да асвятлення працэсу станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Аўтарскі калектыў абапіраўся на метадалогію прычыннай абумоўленнасці і заканамернасці развіцця гістарычных падзей і з'яў. Гэта дазволіла па-новаму падысці да асвятлення многіх складаных фактаў, падзей і з'яў, глыбока даследаваць гісторыю руху беларускага народа да дзяржаўнага самавызначэння.

Пры аналізе складанага гістарычнага шляху набыцця дзяржаўнасці аўтары зыходзілі з таго, што дзяржаўнасць як навуковая катэгорыя – гэта неад'емнае права этнанацыянальнай супольнасці, яе патэнцыяльная здольнасць і практычная магчымасць працяглага самастойнага гістарычнага існавання і развіцця, а дзяржава (дзяржаўнае ўтварэнне) – канкрэтна-гістарычная форма рэалізацыі гэтага права ў часе *і прасторы. Даследуючы* дыялектычную ўзаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць дзяржаўнасці і дзяржавы, аўтарскі калектыў распрацаваў новую канцэпцыю гісторыі развіцця беларускай дзяржаўнасці. У першай кнізе было абгрунтавана, што беларуская дзяржаўнасць як адзінае цэлае знайшла ўвасабленне ў дзвюх непарыўных формах – гістарычнай і нацыянальнай.

Гэта патрабавала даследавання працэсу складвання і развіцця гістарычных перадумоў, якія ў канцы XVIII – пачатку XX ст. аказвалі ўплыў на зараджэнне палітычнага руху беларусаў да набыцця нацыянальнай дзяржаўнасці. Важнейшымі з іх былі нацыянальныя і класавыя супярэчнасці, якія самым непасрэдным чынам закраналі інтарэсы карэннага насельніцтва беларускіх губерняў. Нацыянальныя супярэчнасці былі выкліканы неадпаведнасцю паміж формай нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання Расійскай імперыі і імкненнем этнанацыянальных супольнасцяў, якія яе насялялі, да самавызначэння. Гэтыя супярэчнасці значна ўскладнялі грамадска-палітычнае жыццё ў заходніх губернях Расійскай імперыі.

У грамадскім асяроддзі разгарнуліся вострыя палітычныя дыскусіі па пытанні дзяржаўна-аўтаномнага ўладкавання беларускіх губерняў: паміж прадстаўнікамі карэннага этнасу і расійскімі ўрадавымі ўстановамі, рускімі палітычнымі арганізацыямі і памешчыцка-каталіцкімі прапольскімі грамадскімі

коламі, якія займалі дамінуючае становішча ў сацыяльным жыцці беларускага краю. Войны, паўстанні, рэвалюцыі, дзейнасць на тэрыторыі Беларусі палітычных партый, у праграмах якіх было актуалізавана нацыянальнае пытанне, значна абвастралі гэтыя палітычныя супярэчнасці.

Намаганні правячых колаў Расійскай імперыі, накіраваныя на арганічнае «зрастанне» беларускіх губерняў з тэрыторыямі карэннай Расіі, не прынеслі жаданых вынікаў. Гэта нараджала новыя грамадскія ініцыятывы. Адной з іх была дзейнасць нелегальных і зарэгістраваных грамадска-палітычных аб'яднанняў і рухаў. У XIX – пачатку XX ст. у цэнтры ўвагі ўладных структур і грамадскіх ініцыятыў (палітычных партый, грамадскіх аб'яднанняў) былі аграрнае і нацыянальнае пытанні. Урад Расіі спадзяваўся вырашыць гэтыя пытанні ў беларускіх губернях, ігнаруючы эканамічныя і палітычныя правы карэннага насельніцтва.

У выніку ў асяроддзі беларускага нацыянальнага руху пачала выспяваць нацыянальна-дзяржаўная ідэя, якая знайшла ўвасабленне ў праграмных дакументах і практычных намаганнях палітычных партый. Беларускія дзеячы звязвалі будучае Расіі з пераходам ад самадзяржаўя да дэмакратычнага ладу і палітычнага развіцця на аснове ўліку інтарэсаў беларускага і іншых народаў, якія яе насялялі. Барацьба за нацыянальныя інтарэсы і была рухаючай сілай, якая спалучала нацыянальна-дзяржаўную ідэю з дзейнасцю беларускіх грамадска-палітычных лідараў, арганізацый і груп рознага сацыяльнага складу. Кансалідацыя беларускіх рабочых і сялян з мясцовым дваранствам і буржуазіяй на грунце барацьбы за аўтаномнае ўладкаванне краю прывяла да фарміравання рэальнай сацыяльнай сілы, з інтарэсамі якой нельга было не лічыцца. У пачатку XX ст. амаль усе палітычныя плыні, якія прадстаўлялі інтарэсы беларускай нацыі, арыентаваліся на аўтаномна-дзяржаўнае развіццё краю ў складзе дэмакратычнай Расійскай федэратыўнай рэспублікі. Але ў гады Першай сусветнай вайны пытанне беларускай дзяржаўнасці набыло іншае палітычнае гучанне, пачала прабіваць сабе дарогу ідэя стварэння незалежнай беларускай дзяржавы.

Лютаўская рэвалюцыя актуалізавала на ўрадавым узроўні пытанне дзяржаўнага ўладкавання Расіі на прынцыпах федэралізму. У гэтых умовах ідэя стварэння незалежнай Беларускай дзяржавы атрымала магчымасць для далейшага развіцця. Аднак толькі на праграмна-тэарэтычным і дэкларацыйным пачатках. Лідары расійскай дэмакратыі не жадалі ўлічваць правы і інтарэсы нетытульных народаў, што прывяло краіну да глыбокага палітычнага і сацыяльнага крызісу.

Кастрычніцкая рэвалюцыя адкрыла новыя перспектывы. Але для рабоча-сялянскай улады на першым месцы было вырашэнне сацыяльна-класавага, а для беларускага руху – нацыянальнага пытання. Гарманізаваць гэтыя інтарэсы не ўдалося. Рознасць пазіцый адбілася на працы Першага Усебеларускага з'езда і абумовіла раскол нацыянальнага руху.

Палітычным вынікам такіх працэсаў з'явілася дзейнасць часткі беларускай эліты, накіраваная на рэалізацыю ідэі беларускай дзяржаўнасці ў форме БНР.

На тэарэтычна-дэкларацыйным узроўні БНР была суверэннай і незалежнай, але яна не здолела рэальна інстытуалізавацца. Разам з тым беларускі народ здабыў права на стварэнне дзяржавы. Яго нацыянальная эліта валодала здольнасцю, неабходнай для ажыццяўлення гэтага права. Але геапалітычныя ўмовы, у якіх знаходзілася Беларусь у гады Першай сусветнай вайны, не дазволілі беларусам рэалізаваць ідэю дзяржаўнасці праз набыццё суверэнітэту ў рамках этнічнай тэрыторыі і вырашэнне сацыяльна-эканамічных, палітычных пытанняў на яго аснове.

Імкненне часткі нацыянальнай эліты да рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове было выніковым. Беларуская савецкая дзяржаўнасць стала рэальнасцю. БССР выступіла ў якасці адной з краін – заснавальніц шматнацыянальнага СССР. У створанай федэратыўнай дзяржаве Савецкая Беларусь, як і іншыя рэспублікі – суб'екты федэрацыі, па форме з'яўлялася дзяржавай, хаця магчымасці ў рэалізацыі дэклараванага суверэнітэту былі абмежаваны Канстытуцыяй СССР. Гэтым былі абумоўлены працэс тэрытарыяльнага ўладкавання, фарміравання і дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і кіравання рэспублікі, тыя недахопы і пралікі ў правядзенні нацыянальна-дзяржаўнай палітыкі, якая не заўсёды была накіравана на ўмацаванне дзяржаўнасці і не ва ўсіх адносінах адпавядала інтарэсам карэннага насельніцтва БССР. Лёсавызначальным стала вырашэнне тэрытарыяльнага пытання шляхам уз'яднання Беларусі восенню 1939 г. Гэта быў выключна справядлівы і выніковы дзяржаватворны працэс, які адпавядаў інтарэсам беларускага народа.

Цяжкія выпрабаванні, якія выпалі на долю нашага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, не зламалі беларусаў, не прымусілі іх адмовіцца ад ідэі незалежнасці. У гады Вялікай Айчыннай вайны на акупіраванай тэрыторыі Беларусі разгарнулася вострае і непрымірымае процістаянне беларускага грамадства супраць германскіх акупантаў і тых, хто здрадзіў нацыянальна-дзяржаўным інтарэсам. Беларускі народ не ўспрыняў нацысцкую ідэалогію і сістэму акупацыйнага рэжыму ў якасці нацыянальных каштоўнасцей, на што з самага пачатку разлічвалі агрэсары. Ваенна-палітычныя колы Германіі рабілі ўсё магчымае, каб навязаць народам акупіраваных краін нацысцкую палітычную дактрыну іх будучыні.

Але ні масавыя рэпрэсіі, ні жудасныя расправы над насельніцтвам не зламалі волю народа да супраціўлення акупантам. Беларускі народ самаахвярна ўзняўся на барацьбу супраць захопнікаў. Гэта быў усенародны рух антыгерманскага супраціўлення, накіраваны на адстойванне незалежнасці Бацькаўшчыны, захаванне сваіх нацыянальных традыцый і духоўных каштоўнасцей.

Пасля Вялікай перамогі стваральная праца ўсіх народаў СССР, у тым ліку і беларускага, была накіравана на адбудоўванне краіны, стварэнне спрыяльных умоў для далейшага руху наперад у дзяржаўным будаўніцтве, развіцці эканомікі і нацыянальнай культуры. Моцнымі геапалітычнымі фактарамі, якія садзейнічалі ўмацаванню беларускай савецкай дзяржаўнасці, былі ўдзел БССР у стварэнні ААН, ліквідацыя антысавецкіх тэрарыстычных арганізацый і груп.

У першыя пасляваенныя гады савецкай дзяржавай праводзіліся, у тым ліку і ў БССР, палітыка-ідэалагічныя кампаніі, выхаваўчая работа па лініі партыйных, прафсаюзных арганізацый, сярод моладзі. Адначасова ішоў працэс аднаўлення структуры савецкай дзяржаўнай улады: рэспубліканскага, абласнога, раённага і пасялковага ўзроўняў.

Працэс дзяржаўнага будаўніцтва ў СССР і БССР знаходзіўся пад моцным уздзеяннем камуністычнай ідэалогіі. Ідэалагічныя прыярытэты КПСС–КПБ у вобласці тэорыі і практыкі сацыялістычнага будаўніцтва ў 1953–1985 гг. з'явіліся фактарам, які не спрыяў пераадоленню ўплыву сацыяльнага негатыву на ўзаемаадносіны паміж уладай і грамадствам, правячай партыяй і дзяржаўнай уладай, савецкай федэрацыяй і яе суб'ектамі. Гэтыя ідэалагічныя супярэчнасці абумовілі ўзнікненне грамадскай незадаволенасці ўзроўнем і якасцю сацыяльна-эканамічнага і нацыянальна-культурнага развіцця, нівеліроўкай народнай дэмакратыі.

Асноўным фактарам, які абумовіў эвалюцыю грамадскай незадаволенасці палітыкай КПСС–КПБ, рост апазіцыйнасці, была неадпаведнасць паміж шматлікімі абяцаннямі правячай партыі, спадзяваннямі народа на іх рэалізацыю і жыццёвымі рэаліямі. Расчараванне вынікамі пабудовы развітога сацыялізму, якое ахапіла савецкае грамадства ў сярэдзіне 1980-х гадоў, падштурхнула кіраўніцтва СССР да пошуку новых накірункаў эканамічнага і палітычнага развіцця краіны. Аднак савецкая палітычная эліта не здолела прапанаваць грамадству тэарэтычна-абгрунтаваную перспектыву далейшага гістарычнага прагрэсу існуючай сістэмы.

Замест гэтага кіраўніцтва СССР узяло курс на перабудову існуючай сістэмы – палітыку, якая не мела ні навукова-канцэптуальнага абгрунтавання, ні пэўнага ідэалагічнага вымярэння ў межах тагачаснай сістэмы, ні праграмна-мэтавага забеспячэння па сродках, рэсурсах, прыярытэтах, сацыяльных выдатках, тэмпах, накірунках, храналагічных межах. У выніку атрымалася, што перабудова як мадэрнізацыйная палітыка ў галіне эканомікі, эвалюцыйная ў галіне сацыяльнай палітыкі і рэвалюцыйная ў галіне дзяржаўнага і федэратыўнага ўладкавання па форме і змесце набыла некантралюемы разбуральны характар і прывяла да ліквідацыі савецкай дзяржаўнасці. Гістарычны працэс ліквідацыі СССР па змесце аб'ектыўных складнікаў (наяўнасці адзначаных вышэй супярэчнасцяў, крызісу) быў распадам, але па форме дзейнасці суб'ектыўных фактараў – дзеяннях улады і правячай партыі, банкруцтве інстытута прэзідэнцтва ў СССР, развіцці і накіраванасці апазіцыйных грамадска-палітычных ініцыятыў, арганізацый, рухаў – гэта было паступова-павольнае разбурэнне савецкай дзяржавы.

Распад СССР прывёў да таго, што многія суб'екты гэтага геапалітычнага федэратыўнага ўтварэння вярнуліся да гістарычных (дасавецкіх) формаў дзяржаўнасці. Беларускі народ не адмовіўся ад станоўчага вопыту савецкага перыяду гісторыі, у тым ліку дзяржаўнасці. Менавіта прынцыпы гістарычнай пераемнасці і эвалюцыйнасці, якія былі пакладзены ў аснову дзяржаватворных працэсаў

пасля 1991 г., стварылі найбольш спрыяльныя ўмовы і магчымасці для пераадолення сістэмнага крызісу і паступовага прагрэсу краіны ва ўмовах жорсткай сусветнай канкурэнцыі паміж асноўнымі геапалітычнымі цэнтрамі сілы.

Незалежнасць для нацыянальнай эліты і ўсяго беларускага народа не з'явілася нечаканасцю. У перыяд 1985–1991 гг. у БССР склаліся аб'ектыўныя і суб'ектыўныя перадумовы, якія садзейнічалі непазбежнаму руху Беларусі да незалежнасці. У гэты час дзяржаватворныя працэсы развіваліся на аснове рэальнай адказнасці дзеючай улады за далейшы лёс краіны. Для суверэннай беларускай дзяржавы найбольш складаным быў перыяд з 1991 па 1994 год. У гэты час заканадаўчая, выканаўчая і судовая галіны дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь яшчэ не здолелі адказна і зладжана працаваць у новых умовах. Паміж імі ішла барацьба, якая прывяла да своеасаблівага палітычнага двоеўладдзя – з аднаго боку ўлады Вярхоўнага Савета, а з другога – улады Савета Міністраў краіны. Такое становішча негатыўна адбівалася на дзяржаўным будаўніцтве, было адной з прычын, якая абумовіла пераход ад парламенцкай да прэзідэнцкай рэспублікі.

Сучасная беларуская дзяржаўнасць цесна звязана з інстытутам прэзідэнцтва. Увядзенне пасады Прэзідэнта адкрыла новы этап у развіцці беларускай дзяржаўнасці. Інстытуцыянальныя супярэчнасці, уласцівыя Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 г., былі пераадолены мірным, негвалтоўным шляхам, дзякуючы шырокаму выкарыстанню на практыцы розных формаў прамога народаўладдзя. Гэта дазволіла захаваць палітычную стабільнасць у краіне і выйсці з эканамічнага крызісу.

Фарміраванне новых органаў дзяржаўнай улады пачалося з прэзідэнцкіх выбараў 1994 г. і ў асноўным завяршылася пасля рэспубліканскага рэферэндуму 24 лістапада 1996 г. У выніку склалася палітычная сістэма, у якой інстытут прэзідэнцтва з'яўляецца галоўным органам дзяржаўнай улады. Але важнейшым вынікам пераходу да прэзідэнцкай рэспублікі было тое, што беларускі народ стварыў сапраўды суверэнную і незалежную дзяржаву – асноўную аб'ектыўную перадумову гістарычнага руху народа да моцнай і квітнеючай Беларусі.

Палітычныя партыі, якія былі створаны ў 1991–1994 гг., нягледзячы на розную ідэалагічную накіраванасць, у праграмных дакументах выступалі за суверэнную і незалежную Беларусь, дэмакратычную сацыяльную прававую дзяржаву, за далейшае нацыянальна-дзяржаўнае і культурнае будаўніцтва, за рэфарміраванне эканомікі і стварэнне рынку; умацаванне і развіццё эканамічных, палітычных, культурных, навуковых сувязей з Расіяй, іншымі краінамі СНД, дзяржавамі Еўрапейскага саюза. Менавіта на гэтых прынцыпах і грунтуецца Канстытуцыя суверэннай Беларусі. Станаўленне шматпартыйнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь з'яўлялася неад'емным элементам дэмакратызацыі беларускай дзяржавы.

Знешняя палітыка суверэннай і незалежнай Беларусі была накіравана на абарону нацыянальных інтарэсаў, стварэнне неабходных перадумоў для пасля-

ховага сацыяльна-эканамічнага і нацыянальна-культурнага развіцця краіны. Шматвектарнасць знешняй палітыкі – гэта аб'ектыўная неабходнасць, абумоўленая геапалітычным становішчам Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым прыярытэты ў двухбаковых адносінах вызначаліся выніковасцю гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі.

Ці ёсць яшчэ далейшыя магчымасці для прадметнага даследавання тэмы беларускай дзяржаўнасці? Безумоўна ёсць. Найперш у рэчышчы сістэмнага вывучэння гісторыі беларускай дзяржаўнасці па ўсіх напрамках: эканамічным, ваенным, нацыянальна-культурным, сацыяльным і інш. Важнай праблемай з'яўляецца неабходнасць адлюстравання гісторыкамі структуры, сістэмы і вынікаў працы органаў мясцовага кіравання і самакіравання Рэспублікі Беларусь. Даволі актуальным з'яўляецца даследаванне гісторыі беларускага парламентарызму, нацыянальна-культурнага будаўніцтва, якое ўласціва суверэннай беларускай дзяржаве. Таму праца над праблемай будзе працягвацца.

**Гісторыя** беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.
Г30 У 2 кн. Кн. 2 / М. У. Смяховіч [і інш.] ; рэдкал. : А. А. Каваленя [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 654 с.

ISBN 978-985-08-1487-6.

У другой кнізе калектыўнай манаграфіі ўпершыню паказана развіццё беларускай дзяржаўнасці пасля аб'яднання беларускага народа ў 1939 г., яе стан у час Вялікай Айчыннай вайны, адлюстравана пасляваеннае дзяржаўнае будаўніцтва, раскрыты працэс станаўлення і ўмацавання незалежнай, суверэннай дзяржавы – Рэспублікі Беларусь.

Рэкамендуецца для выкарыстання ў навукова-даследчай працы і вучэбным працэсе. Разлічана на выкладчыкаў ВНУ, студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, настаўнікаў, супрацоўнікаў аддзелаў ідэалагічнай работы мясцовых адміністрацый, творчую інтэлігенцыю, шырокае кола чытачоў, не абыякавых да айчыннай гісторыі.

УДК 94(476)"17/20"
БКК 63.3(4Беи)5